# ЖЫЎ, КАБ ПОМНІЛІ
(аб Ермалаеве У.Ф.)

Арбузаў А.Ц.,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

У кожнага чалавека ў жыцці ёсць моманты, аб якіх пазней прыходзіцца шкадаваць. Не паспеў запытаць, дапамагчы, падтрымаць… Вось і я вельмі шкадую аб тым, што ў дні сустрэч за трыццаць год сяброўства многага не паспеў: не паспеў запытаць і аб пакутах і здзеках акупантаў над ім у часы вайны, і аб яшчэ больш цяжкім пасляваенным яго жыцці і інш. І толькі цяпер пазнаў цяжар страты Чалавека з вялікай літары, слаўнага сына беларускай зямлі Уладзіміра Фаміча Ермалаева. Да самага апошняга дня ён беспынку працаваў, у тым ліку над сваёй новай, шостай кніжкай. Здаў яе ў друк, прылёг адпачыць і заснуў назаўсёды, адляцеў у вечнасць.

Нарадзіўся будучы паэт 2 студзеня 1933 г. у вёсцы Галавачы Дрыбінскага (зараз Горацкага раёна) Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўніка і калгасніцы. Дзяцінства і юнацкія гады прайшлі ў вёсцы Пятухоўка Чаускага раёна. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны сям'я Ермалаевых пераехала ў вёску Залессе Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці, на радзіму маці. Бацька паэта Фама Васільевіч быў настаўнікам, працаваў загадчыкам пачатковай школы і разам з аднавяскоўцамі быў мабілізаваны на барацьбу з фашыстамі. На фронце ваяваў у чыне малодшага лейтэнанта, кіраваў стралковым узводам, быў паранены і кантужаны. Загінуў 19 кастрычніка 1944 г. у жорсткім баю на польскай зямлі. Так што васьмігадовы юнак Воўка Ермалаеў замяніў у сям'і бацьку і разам з маці і сястрой удосталь паспытаў гаркавага хлеба безбацькаўшчыны.

Народжаны ў сям'і настаўніка, ён рана авалодаў граматай, рана пачаў лічыць, пісаць. Закончыўшы Залескую пачатковую школу з ганаровай граматай, ён тры гады ў любое надвор'е, па бездарожжы хадзіў за сем кіламетраў у вёску Шыркавічы ў школу-сямігодку. Пасля яе заканчэння Уладзімір Ермалаеў паступіў у Мсціслаўскае педагагічнае вучылішча, у якім і пачаў спрабаваць свае творчыя сілы ў мастацкай літаратуры. Першыя вершы запісваў у школьных сшытках, лепшыя аддаваў друкаваць на старонках Мсціслаўскай раённай "Калгаснай газеты". Зараз гэта газета носіць

назву “Святло Кастрычніка”. Яе юбілею, у прыватнасці, паэт прысвяціў верш “Жадаю я табе, раёнка.” Пазней ён друкаваўся ў абласных газетах і рэспубліканскай “Чырвонай Змене”. Закончыў Мсціслаўскае педагагічнае вучылішча паэт з чырвоным дыпломам. У ліпені – жніўні 1953 г. У.Ф. Ермалаеў працаваў выхавацелем Іўеўскага дзіцячага дома Гродзенскай вобласці і адначасова рыхтаваўся да паступлення ў ВНУ.

З верасня 1953 г. У.Ф. Ермалаеў студэнт Мінскага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага. Падчас навучэння ў ВНУ прымаў актыўны ўдзел у грамадскай працы, быў абраны сакратаром камітэта камсамола. Студэнцкія гады, жыццё ў інтэрнаце, грамадская дзейнасць пазнаёмілі і звязалі яго назаўсёды з Галінай Міхайлаўнай Алісенка, студэнткай бібліятэчнага факультэта педінстытута.

Таленавіты студэнт паспяваў усюды: і ў грамадскай дзейнасці, і на падпрацоўках, і на “выдатна” “грыз” навукі. Быў “калінінскім” стыпендыятам і педінстытут закончыў з чырвоным дыпломам. Атрымаў вышэйшую адукацыю настаўніка гісторыі, беларускай мовы і літаратуры і разам з Г.М. Алісенка быў накіраваны на самастойную працу ў горад Смаргонь, дзе ён працаваў настаўнікам вячэрняй школы, а яго каханка – у раённай бібліятэцы. У дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі згулялі вяселле, стварылі сям’ю і ў 1959 г. у іх нарадзіўся сын Валерый, пазней у 1967 г. – дачка Вікторыя. Зараз у сямействе Ермалаевых тры ўнукі і адна ўнучка.

Маладога, працавітага настаўніка ў хуткім часе прыкмецілі і запрасілі працаваць інспектарам Смаргонскага раённага аддзела адукацыі. Але доўга пабыць на пасадзе інспектара не давялося. На раённай камсамольскай канферэнцыі ў снежні 1959 г. яго абралі другім сакратаром Смаргонскага райкама камсамола. У сакавіку 1960 г. прынялі ў члены КПСС, а ў верасні 1961 г. Уладзімір Фаміч ужо стаў першым сакратаром гэтага ж райкама камсамола.

Па накіраванню Гродзенскага абкама Кампартыі Беларусі з верасня 1962 г. У.Ф. Ермалаеў вучыўся ў Мінскай Вышэйшай партыйнай школе, але ўжо ў маі 1963 г. на бюро ЦК ЛКСМБ быў зацверджаны на пасаду інструктара аддзела школьнай і студэнцкай моладзі ЦК ЛКСМБ. За самаадданую працу з моладдзю ЦК УЛКСМ узнагародзіў яго Ганаровым Знакам “За актыўную работу ў камсамоле”. З кастрычніка 1964 г. У.Ф. Ермалаеў – старшы рэферэнт, кіраўнік сектара па працы з замежнымі студэнтамі і

іншаземных сувязей Міністэрства вышэйшай адукацыі БССР, а затым – загадчык аддзела па навучанню іншаземных студэнтаў і іншаземных сувязей.

Пасля работы ў Міністэрстве пачаўся перыяд выкладчыцкай дзейнасці. У кастрычніку 1968 г. ён быў зацверджаны на пасаду намесніка дырэктара рэспубліканскага міжгаліновага Інстытута павышэння кваліфікацыі кіруючых працаўнікоў і спецыялістаў галін народнай гаспадаркі БССР і адначасова працаваў старшым выкладчыкам. Са жніўня 1975 г. восем гадоў Уладзімір Фаміч працаваў выкладчыкам кафедры "Гісторыя КПСС" Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў. Адначасова вучыўся ў завочнай аспірантуры пры Мінскім педагагічным інстытуце імя А.М. Горкага. 7 красавіка 1982 г. Ермалаеў У.Ф. паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Дзейнасць Кампартыі Беларусі па ўмацаванню сувязей навукі з прамысловай вытворчасцю". У 1983 г. ён выконваў абавязкі дацэнта кафедры "Навуковы камунізм" Мінскага радыётэхнічнага інстытута. У кастрычніку 1983 г. быў абраны па конкурсу старшым выкладчыкам, а ў снежні 1985 г. – дацэнтам кафедры "Гісторыя КПСС" Беларускага палітэхнічнага інстытута. У красавіку 1991 г. кафедра "Гісторыя КПСС" атрымала назву кафедра "Гісторыя, сусветная і айчынная культура", а БПІ быў перайменаваны ў Беларускую дзяржаўную палітэхнічную акадэмію, з красавіка 2002 г. – у Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт.

Працуючы выкладчыкам да ліпеня 1994 г., У.Ф. Ермалаеў вялікую ўвагу ўдзяляў павышэнню лектарскага майстэрства і навукова-метадычнай кваліфікацыі, падрыхтаваў і надрукаваў звыш 30 навуковых прац, прысвечаных пытанням сувязі навукі з прамысловай вытворчасцю. Ён актыўна ўдзельнічаў у грамадска-палітычным жыцці ВНУ, горада, рэспублікі, уваходзіў у склад рэдкалегій інстытуцкіх газет, з'яўляўся пазаштатным лектарам аддзела прапаганды Мінскага абкама Кампартыі Беларусі, старшынёй навукова-метадычнага Савета пры праўленні Мінскай абласной арганізацыі "Веды", старшынёй секцыі лектараў-міжнароднікаў. Ермалаеў У.Ф. карыстаўся вялікай павагай сярод прафесарска-выкладчыцкіх калектываў і студэнцкай моладзі, сярод працаўнікоў Рэспублікі Беларусь. Таварыства "Веды" у 1989 і 1990 гады надрукавала дзве яго брашуры "Методыка падрыхтоўкі і

чытанне лекцый па праблемам знешнепалітычнай дзейнасці КПСС і Савецкай дзяржавы" і сумесна з Арбузавым А.Ц. – "Агульнаеўрапейскі дом: канцэпцыя і рэаліі".

Лічыцца, што з ліпеня 1994 г. У.Ф. Ермалаеў на заслужаным адпачынку, пенсіянер. Але такому чалавеку не да адпачынку: ён пабудаваў дачу ў Крыжоўцы, узброіўся пішучай машынкай і на прыродзе, пад божым сонцам распачаў актыўную літаратурную працу. Усе раннія сатырычныя гумарэскі Уладзіміра Ермалаева, як гэта не парадаксальна, пачалі публікавацца падчас бурлівых сацыяльных перамен, на ўзмежжы разбурэння Савецкага Саюза, калі, здавалася б, не да вясялосці. Друкаваліся яны ў часопісу "Вожык", газеце "Літаратура і мастацтва" і іншых выданнях, гучалі па рэспубліканскім радыё і тэлебачанні. І менавіта ў той час, калі Беларусь атрымала самастойнасць і незалежнасць, вельмі хутка ў Уладзіміра Фаміча з'явілася як бы другое дыханне, успыхнула зорка беларускага сатырыка-гумарыста.

Усёй сваёй творчасцю ён сцвярджаў, што пра жыццё беларускае і гісторыю, пра зямлю і прыроду, пра людзей зямлі гэтай, роднага краю, пра ўсё гэта трэба пісаць, чытаць, выкладаць і размаўляць пабеларуску. У гэтым сэнсе творчасць яго – гэта творчасць сына зямлі беларускай: па жыццёвым матэрыяле, па ідэйнай накіраванасці, праблематыцы, вобразнай сістэме, па духоўна-эмацыянальнай напоўненасці. Жыццём, лёсам, часам У.Ф. Ермалаеў, як і іншыя паэты яго пакалення, з самага дзяцінства быў далучаны да жыцця народнага, можна сказаць, жыў гэтым жыццём. І вось такі сацыяльны стан выспяваў унутрана – у свядомасці, у душы, угрунтоўваў пачуццё, усведамленне асабістай адказнасці за ўсё, што тварылася ў жыцці. Тут агульнае было асабістым, асабістае ў істотных момантах выяўляла агульнае.

Багацце жыццёвага матэрыялу, эмацыянальны напор непасрэдных ураджанняў, унутраная прага непасрэднага ўдзелу былі настолькі моцнымі, жыццёва і творча неабходнымі, што публіцыстычналірычны струмень прарываўся ў самую мастацкую паэтычную стыхію. Асабліва адчуваецца гэта ў творах з аўтабіяграфічнай асновай, прысвечаных сваім паплечнікам, сябрам (вершы "Вы шуміце…", "Тудэма – сюдэма", "Сказ пра дачніка Пятра", кніга "Пераход колькасці ў колкасці" і інш.).

Трэба сказаць, што напісанне значнай часткі пародый, гумарыстычных вершаў менавіта прыйшлося на перабудоўчую неразбярыху. Яе зігзагі і грымасы многімі чытачамі ацэньваліся неадназначна. Большасць сатырычных і гумарыстычных вершаў, варта дадаць, звязана было з падзеямі постперабудовачнага часу. Незадаволены фактам адрыву навукоўцаў-выкладчыкаў ад іх непасрэднай працы і пасылам у калгас па нарыхтоўку сенажу для жывёлы, У.Ф. Ермалаеў адаслаў тэлеграму на імя Генеральнага сакратара ЦК КПСС Гарбачова М.С. Ён і пазней заўсёды заставаўся смелым, рашучым і накіроўваў свае вострыя сатырычныя стрэлы на хібы і недахопы ў жыцці, супраць курэння і п’янства, а сваіх “герояў” выстаўляў на ўсеагульнае высмейванне.

За трыццаць год кіпучай творчасці з-пад пяра У.Ф. Ермалаева выйшла столькі твораў сатыры і гумару, што, хочаш – не хочаш, настаў час “выстраліць” іх асобнай кніжкай. Услед за кніжкай ”Хто не смяецца, той не есць” (1994) з’яўляюцца кнігі “Пераход колькасці ў колкасці” (1997), затым “Радком па кумпалу”(1998), “Дулі будуць апасля”(2004), “Смехам закаханыя”(2008).

Памкненне да гармоніі ў душы і “выпраменьванне” душэўнай цеплыні сфарміравала жыццёвае крэда паэта. У яго лірыцы прырода і чалавек знітаваныя ў адно цэлае праз адчуванне прыгажосці (вершы “Нарачанская легенда”, “Лім і Ліма”, “Знаёмая незнаёмка”, “Любоў мая азёрная” і інш.), тонка спалучаны настальгічны сум аб мінулым і спакойна ўзнёслы тон бадзёрага аптымізму (вершы “Прыазёрны вальс”, “Піяністка”, “Нарачанскае лета”). У.Ф. Ермалаеў сузірае свет с пазіцыі апавядальніка-назіральніка і дае параду незнаёмаму яму чалавеку, як знайсці выйсце да Бога. Не быў набожны, але верыў, што смех не грэх, а дар Божы і лічыў, што лепш жартаваць, чым гараваць і добры смех з’ўляецца найлепшым лекарам.

Ермалаеў У.Ф.  любіў выступаць сярод людзей, простых людзей і асабліва сярод людзей на адпачынку. З лекцыямі і творчымі вечарынамі ён аб’ездзіў усю Беларусь, асабліва любіў працаўнікоў нарачанскага краю, выступаць у санаторыях “Нарач”, “Белая Русь”, “Прыазёрны” і інш. Напісаў нават “Нарачанскі гімн”, пакладзены на музыку. Яго вершы, мініяцюры былі ў асноўным гумарыстычнага і сатырычнага характару. Але асаблівага поспеху ён дабіўся як вялікі мастак-парадыст. З пад яго пяра выйшлі шматлікія літаратурныя пародыі як на сваіх блізкіх сяброў, паплечнікаў, так і амаль на ўсіх

сучасных паэтаў. Пасля публікацыі трох зборнікаў У.Ф. Ермалаева ў 1998 г. прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі, дзе ён прымаў актыўны ўдзел ў грамадскім жыцці пісьменнікаў і карыстаўся вялікім аўтарытэтам, павагай калег па рабоце, сяброў, шматлікіх прыхільнікаў паэтычнага, дасціпнага мастацкага беларускага слова.

Больш дваццаці гадоў выступаў Уладзімір Фаміч у розных установах, калгасах, саўгасах, на прадпрыемствах Беларусі і ўсюды яго сустракалі з павагай. У яго прамовах, сатырычных і гумарыстычных вершах уражвае дакладнае веданне глыбінь жыцця беларусаў, іх літаратуры, гісторыі. Як сапраўдны майстар, сын вёскі, сатырык, ён умела выкарыстоўваў багацце роднай беларускай мовы, у тым ліку розныя ўстойлівыя словазлучэнні. Там, дзе вядзецца размова пра грамадска-важныя справы, ён бескампрамісна едкі, гаворыць прама і адкрыта, нярэдка востра і рэзка. Часцей усяго ў творах паэта праглядваюцца канкрэтныя сітуацыі з нашага паўсядзённага жыцця. Трывогай і болем прасякнуты яго вершы “Цана абутку”, “Калгаснікам”, “Пустое месца” і інш.

Сярод чытачоў вялікую папулярнасць паэту, аднаму з лепшых парадыстаў краіны, прынеслі кнігі “Дулі будуць апасля” і “Смехам закаханыя”, дзе надрукаваны не толькі гумарыстычныя пародыі, але і лірыка, і сатыра. У кнізе “Смехам закаханыя” убачыла свет і, нарэшце, упершыню з 1984 г. была надрукавана і яго першая праца часоў выкладчыцай дзейнасці ў БПІ – “Кафедральный сенаж”. Гэту сельскую, цікавую паэму спачатку Арбузаў А.Ц. надрукаваў, сбрашураваў у колькасці 5 асобнікаў, якія затым “хадзілі па руках”, і толькі праз 24 гады яна была надрукавана ў кнізе выдавецтвам “БелАніГал”.

Уладзімір Фаміч як паэт-лірык вельмі любіў музыку. У яго было шмат рознай радыё-тэлетэхнікі, меў свой густ. З радыё ён клаўся спаць і пад звесткі радыё падымаўся. Любіў і вырошчваў вельмі прыгожыя ружы, розныя кветкі, увогуле усё прыгожае. Калі выходзіў у сад, агарод, уключаў на ганку радыё альбо магнітафон, настройваў гучнасць, каб слухаць не толькі самому, але каб чулі і суседзі. Каб не надакучалі спевы, ён часта абнаўляў рэпертуар, меў сваю фонатэку. Любіў агарод, альпійскія горкі для кветак і, вядома, сад, якога не хапала ў дзяцінстве. Падчас савецка-фінляндскай вайны зімой 1939-1940 гг. сады ў Беларусі павымярзалі. Так што ў маленстве яму не прышлося з’есці не толькі цукерку, але часам нават і яблычка.

У Фаміча на дачы яблыкаў кожны год было столькі, што прыходзілася мяшкамі развазіць сябрам, астаткі тачкамі адвозіў у лес.

Ён вельмі любіў сваю сям'ю. Адзначыў залатое вяселле са сваёй адзінай каханкай Галінай Міхайлаўнай. Дачакаўся ад сына двух хлапцоў і ад дачкі – унука і ўнучку. На вяселлі старэйшага ўнука Уладзіміра паспеў паскакаць з маладзейшай унучкай Каралінай. Як і Галіна Міхайлаўна, Уладзімір Фаміч усё аддаваў сям'і: любоў і цеплыню душы, матэрыяльныя здабыткі, – усё. Любіў бываць прыстойна ў гасцях і яшчэ больш прымаць тых гасцей, сяброў: землякоў Ларчанку У.І., Ждана О.А., Максюту О.М. і інш. А калі збіраліся да яго на вул. Захарава такія ж паэты-парадзісты, як ён, то гэта быў такі "капуснік", якому пазайздросцілі б усе выдавецтвы і многія сцэнарысты. Для ўсіх, каму давялося бываць там, такія сустрэчы засталіся ў памяці на ўсё жыццё.

У сувязі з васьмідзесяцігадовым юбілеем Уладзіміра Фаміча Ермалаева Саюз пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь адзначыўяго сваёй вышэйшай узнагародай – медалём "За вялікі ўклад у літаратуру". Гэта ўзнагарода як бы ўскалыхнула яго і натхніла на новыя творчыя здабыткі. Так і з'явілася ў 2015 г. новая, шостая кніжка паэта ў самай прэстыжнай серыі "Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі" пад назвай "Смех у мех, а сум у торбу" у выдавецтве "Чатыры чвэрці". У час працы над кнігай Уладзімір Фаміч з удзячнасцю прымаў не толькі парады сяброў, але і прапановы супрацоўнікаў выдавецтва – рэдактара Ірыны Чарняўскай і дырэктара Ліліяны Анцуг, якая нават змясціла свой артыкул "Замест некралога, або нататкі выдаўца".

Як сцвярджалі ў свой час мэтры інтэлектуальнай думкі, смех – гэта найкарацейшая адлегласць паміж людзьмі, а што зрабілася смешным, тое ўжо не можа быць небяспечным. І не трэба заганяць смех у які-небудзь мех, усё роўна ён адтуль, як шыла, вытыркнецца. Таму апошняе выданне твораў Ермалаева У.Ф. і носіць назву "Смех у мех, а сум у торбу". А плюшкіны ды манілавы, хіхікалы і трындычыхі, на жаль, не перавяліся і ў наш камп'ютарна-лазерны век. І таму Уладзімір Фаміч Ермалаеў са сваімі творамі знаходзіцца і назаўсёды застанецца ў страю. Ён жыў, каб памяталі, і пакінуў такі след, што светлая памяць пра таленавітага паэта, вучонага, выдатнага чалавека, выкладчыка кафедры "Гісторыя, сусветная і айчынная культура" назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.